■ Шчырыя сэрцы

# МЕСЦА, ДЗЕ ЗАЎСЁДЫ ЗРАЗУМЕЮЦЬ І ПАДТРЫМАЮЦЬ...

## Якую ўнікальную дапамогу можна атрымаць у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання

**Васямнаццаць гадоў таму, адразу пасля адкрыцця, дзяржаўная ўстанова «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска» складалася ўсяго з аднаго аддзялення, якое каардынавала дзейнасць сацыяльных работнікаў дома. Зараз жа цэнтр аказвае найшырэйшы спектр паслуг і істотна падтрымлівае ўсе тыя катэгорыі грамадзян, якім патрэбна асаблівая ўвага. Толькі за першы квартал 2018 года тэрытарыяльны цэнтр аказаў больш за 40 тысяч паслуг.**

Так, як адзначыла **дырэктар цэнтра Інеса ЖЫБУЛЬ,** з верасня мінулага года на базе цэнтра дзейнічае паслуга дзённага знаходжання маладых людзей з цяжкімі і множнымі парушэннямі. Навацыя вырашае адразу дзве глабальныя задачы. Па-першае, у маладых людзей, якім цяжка самастойна перасоўвацца і абслугоўваць сябе, з'явілася магчымасць выйсці з замкнёнай прасторы дома або кватэры, паглыбіцца ў соцыум і атрымліваць комплекс сацыяльна-рэабілітацыйных паслуг. Па-другое, іх бацькі, якія раней былі прывязаныя да дзяцей не толькі эмацыянальна, але і фізічна, зараз могуць уладкавацца на працу ў дзённы час. Тым больш, відавочна, што такі фармат баўлення часу ідзе маладым людзям толькі на карысць — памяшканне, дзе яны знаходзяцца, аснашчана самым сучасным рэабілітацыйным абсталяваннем. З падапечнымі цэнтра працуюць не толькі спецыялісты па сацыяльнай рабоце, але і дэфектолагі, псіхолагі, эрготэрапеўты, якія дапамагаюць маладым людзям сацыялізавацца і паступова развіваць іх лепшыя здольнасці.

— Накont гэтага ў нас ёсць вельмі натхняльны прыклад. У групу дзённага знаходжання трапіла дзяўчына, якая перасоўвалася толькі ў спецыяльных тэхнічных сродках са староннай дапамогай. Але, бачачы вялікі патэнцыял, спецыялісты падчас заняткаў навучылі яе хадзіць самастойна. Цяпер дзяўчына можа не толькі перасоўвацца сама, але і дапамагаць іншым, — расказвае **намеснік дырэктара цэнтра Таісія ЗЕНАВА.**

Зараз аддзяленне наведвае васямнаццаць чалавек узростам ад 16 да 40 гадоў, у найбліжэйшы час група павінна папоўніцца яшчэ пяццю новымі наведвальнікамі.

Вялікую ўвагу супрацоўнікі цэнтра ўдзяляюць тэме працідзеяння хатняму гвалту. Дзейнічае мабільная гарачая лінія для пацярпелых, таксама сацыяльныя работнікі, якія часта бываюць у сем'ях, праходзяць спецыяльнае навучанне ў дасведчаных кваліфікаваных трэнераў на тэмы таго, як распазнаць хатні гвалт, як мець зносіны з пацярпелымі і куды іх накіроўваць па дадатковую дапамогу. Трохі памяняўся і ракурс успрымання праблемы. Усё часцей гаворыцца пра тое, што гвалт можа быць не толькі фізічным, але і псіхалагічным ці эканамічным, калі цалкам пазбаўляюць грашовых сродкаў або нават выганяюць з дому. Акрамя таго, значныя намаганні прыкладаюцца, каб прадухіляць хатні гвалт у дачыненні да пажылых людзей.



Студыя «Палітра».



Аддзяленне дзённага знаходжання.

Дарэчы, на базе цэнтра запушчаны сумесны праект з Беларускім інстытутам правазнаўства «Юрыдычная клініка». Тыя, хто мае патрэбу, могуць атрымліваць бясплатна дапамогу выкладчыкаў і студэнтаў старшых курсаў, прычым не проста кансультацыйную, а паўнавартасныя паслугі адваката. Прыёмы прыходзяць два разы на тыдзень. Супрацоўнічае тэрытарыяльны цэнтр і з БДПУ імя М. Танка: тут адкрыты філіял кафедры сацыяльнай работы. Апроч таго, што студэнты атрымліваюць практычны вопыт, яны яшчэ і праводзяць каштоўную даследчую працу: супрацоўнікі цэнтра могуць прапанаваць ім найбольш актуальныя тэмы для курсавых і дыпломных работ.

Добра вядомы па ўсёй Беларусі і нават за мяжой Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска дзякуючы такім праектам, як студыя «Палітра», дзе людзі з ментальнай інваліднасцю займаюцца мастацкай творчасцю, тэатр «Сонечныя дзеці», у якім займаюцца маладыя людзі з сіндромам Даўна. Вялікай папулярнасцю карыстаецца і «Лятучы клуб мам», арганізаваны па прыкладзе партнёраў з Польшчы. Гэта прастора, дзе сустракаюцца мамы, якія знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці, альбо мамы, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. Яны ўдзельнічаюць у майстар-класах па жаночым лідарстве, прадпрымальніцтве, хэнд-мэйдзе ды і проста гутараць аб сваіх надзённых перажываннях, каб не замыкацца ў сабе і адчуваць падтрымку блізкіх па духу людзей ■

■ Моц ведаў



# Як юныя інтэлектуалы ўпадабалі царыцу навук

## Сталічная гімназія № 41: крэда — перамагаць

**Толькі ўвайшоўшы ў ДУА «Гімназія № 41 г. Мінска імя В. Х. Сярэбранага», адчуваеш асаблівую атмасферу. Гэтаму спрыяе і прыгожы будынак у класічным стылі, і інфармацыя аб дасягненнях вучняў на міжнародных конкурсах па ўсім свеце — адпаведны стэнд сустракае гімназістаў і гасцей, а таксама выстаўкі незвычайных карцін і малюнкаў, якія можна ўбачыць у калідорах. У гэтай навучальнай установе добра ведаюць, як паспяхова сумясціць у навучанні дакладныя навукі і творчасць.**

І ўсё ж у першую чаргу ўстанова славіцца сваім асаблівым падыходам да вывучэння матэматыкі. Як расказала **дырэктар гімназіі Марыяна СКАКУН,** традыцыю заклаў адораны настаўнік Валянцін Хаімавіч Сярэбраны, які натхніў мноства хлопцаў і дзяўчат палюбіць адзін з самых складаных прадметаў школьнай праграмы. Як вынік — шматлікія перамогі на гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных этапах алімпіяд, а таксама шчырае жаданне маладых людзей звязваць сваё жыццё з гэтай навукай. Зараз у гімназіі працуюць вучні і паслядоўнікі Валянціна Сярэбранага, а сама ўстанова адукацыі носіць яго імя. Нестандартны падыход да вывучэння матэматыкі актыўна выкарыстоўваецца тут і зараз: так, ужо з сёмага класа гэты прадмет або факультатывы па ім вядуць выкладчыкі БДУ. Таксама прымяняецца методыка «роўны навучае роўнага», калі старшакласнікі або нават выпускнікі, якія паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы па гэтым профілі, дзеляцца сваімі ведамі з малодшымі вучнямі. Усе намаганні не праходзяць дарма, доказ таму — 14 дыпломаў, атрыманых гімназістамі сёлета на рэспубліканскім этапе алімпіяды. Вядома, сярод лідараў — матэматыка, але таксама добра праявілі сябе вучні ў хіміі і біялогіі. Гэта найлепшы вынік па ўсіх школах і гімназіях у краіне, улічваючы, што гімназія № 41 г. Мінска зусім невялікая: у ёй няма пачатковай школы і вучыцца ўсяго 400 чалавек.



Што да ўдзелу ў маштабных міжнародных конкурсах, то толькі за мінулы навучальны год адораныя падлеткі заваявалі прызавыя месцы на шасці з іх.

Не забываюць у гімназіі і аб развіцці творчых здольнасцяў асобы. Так, па словах **намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталлі ГАЙДУК,** у вучняў ёсць магчымасць наведваць грунтоўныя факультатывы па мастацтве, у праграме — малюнак, кампазіцыя, жывапіс і іншыя кірункі. З дзецьмі займаюцца прафесійныя мастакі. Тэматычныя вернісажы на прасторах гімназіі з працамі юных творцаў пастаянна змяняюць адзін аднаго, удзельнічаюць хлопцы і дзяўчаты і ў больш сур'ёзных выстаўках, нярэдка прывозяць дыпломы з конкурсаў. Наогул, для тых, хто марыць змяніць аблічча любімага горада, стаўшы запатрабаваным архітэктарам, больш удалае месца вучобы ўявіць цяжка. Не дзіўна, што шмат выпускнікоў выбіраюць сабе менавіта гэтую прафесію ў якасці жыццёвага шляху.

Ёсць у дзейнасці гімназіі і яшчэ адзін важны напрамак — ушанаванне гістарычнай і нацыянальнай спадчыны. На базе ўстановы адукацыі дзейнічае музей этнакультуры Беларусі «Святавіт», экспанаты для якога разам збіралі вучні і педагогі. Было праведзена нават некалькі этнаграфічных экспедыцый. Зараз у фондзе музея больш за 200 каштоўных экспанатаў ■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.